*Т. В. Пятрова (Мінск, Беларусь)*

# ПРАДУКТЫЎНАСЦЬ ОНІМНЫХ ТЫПАЎ НА РАКАЎСКІМ ПРАВАСЛАЎНЫМ НЕКРОПАЛІ XIX - ПАЧАТКУ XX СТ.

Увага навуковай супольнасці ў немалой ступені накіравана сёння на правядзенне даследаванняў, якія садзейнічаць больш глыбокаму і ўсебаковаму вывучэнню лакальных асаблівасцей канкрэтных рэгіёнаў і асобных населеных пунктаў.

Асаблівае месца ў комплексе лінгвістычных пытанняў адводзіцца збору і аналізу онімаў на помніках некропаляў, якія не проста заключаюць у сабе інфармацыю аб чалавеку, але з'яўляюцца паказчыкам развіцця моўнай сістэмы канкрэтнага гістарычнага перыяду.

Вельмі цікавым у гістарычных, культурных і моўных адносінах з'яўляецца мястэчка Ракаў, якое, як і большасць беларускіх мястэчак, вызначаецца полікультурнасцю, а ў міжваенны перыяд увогуле выступала ў якасці мяжы між усходам і захадам.

У перыяд з 2005 па 2014 год Ініцыятывай аховы і пашпартызацыі гістарычных могілак Беларусі праводзілася даследаванне і інвентарызацыя старога праваслаўнага некропаля ў Ракаве. На падставе дадзеных інвентарызацыі быў складзены "Каталог надгробкаў" [1, с. 38-42]. Тэксты надмагільных надпісаў з улікам іх удакладнення на мясцовасці былі ўнесены ў Рэестр надпісаў Ракаўскага праваслаўнага некропаля XIX – пачатку XX ст., які складаецца з 260 тэкставых адзінак (за адзінку прыняты надмагільны надпіс).

Аналіз онімных тыпаў на Ракаўскім некропалі дазваляе выявіць самыя распаўсюджаныя прозвішчы сярод праваслаўнага насельніцтва мястэчка ў сярэдзіне XIX – пачатку XX ст., а таксама найбольш пашыраныя прозвішчаўтваральныя фарманты.

На названым некропалі сярод мужчынскіх прозвішчаў (132) група першасных прозвішчаў складае 27 %, што ў цэлым карэлюецца з агульнай сітуацыяй як па рэгіёне, так і па краіне [2, с. 18]. Гэтую групу складаюць прозвішчы, утвораныя лексіка-семантычным спосабам: *Галабурда (2), Мальавка, Марцеля, Буйнило, Вушило, Вушыла, Дяруго, Бруй, Волчекъ (5), Гардей, Желтокъ (4), Жовтокъ, Желток, Мазъ, Мазур (2), Мазуръ, ПодобѢдъ, Саколъ (2), Урбан, Фурс (3), Шастак, Шостакъ*; прозвішчы, утвораныя сінтаксічна-марфалагічным спосабам: *Дубатовка*.

Група другасных прозвішчаў прадстаўлена онімамі суфіксальнага ўтварэння. Сярод найбольш пашыраных на Ракаўскім некропалі прозвішчных тыпаў можна выдзеліць: агульнаслявянскія на ***-іч, -скій, -цкій, -скі, -цкі, -ік, -ев (-еў), -ін***; усходнеславянскія прозвішчныя тыпы на ***-укъ, -енко***; унутрымоўныя прозвішчныя тыпы на ***-ко, -онок*** [2, с. 59].

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ




Табліца 1 – Прадуктыўнасць мужчынскіх прозвішчных тыпаў на Ракаўскім праваслаўным некропалі XIX – пачатку XX стагоддзя

Самы прадуктыўны прозвішчны тып утвараюць прозвішчы на ***-іч / -ич, -ович / -евич***: *Атрасевичъ (3), Барысевичъ, Бугоревичъ, Ватеновичъ, Вашкевічъ, Войничъ, Гормановічъ, Грачевичъ, Грынкевичъ, Гулякевичъ, Дарашевичъ, Драневич, Драневичъ (2), Ждановичъ, Жуловичъ, Каспаревич, Каспаревичъ (4), Кациновичъ, КасцюкѢвичъ, Климовичъ, Ласиновичъ, Мацкевич (2), Машукевичъ, Мисевичъ, Моисиновичъ, Муракевич, Нарушевич, Палюхови[ч], Палюховичъ, Па[нк]евіч, Панкевичъ, Полихович, Полюхович, Полюховичъ, Пастуховичъ, Постуховичъ (2), Постухович, Патаповичъ, Потаповичъ, Радкевичъ, Раткевичъ, Станкевич, Суфрановичъ, Такушевич, Тишевичъ, Юзефовичъ*. Названы прозвішчны тып складае 42 % ад усяго масіву прозвішчаў, што характэрна для паўночнай часткі Мінскай вобласці, а ў цэлым па Беларусі 8% ад агульнага масіву [2, с. 36].

Прозвішчны тып на ***-ский / -цкий, -евский / -овский*** па прадуктыўнасці займае другое месца (21 % ад агульнага масіву) і прадстаўлены наступнымі прозвішчамі: *Буйницкий, Валаевскій, Василевскій, Василевский, Жуковскій (9), Жуковский, Загроскій (2), Залевскій, Кошолевский, Крапвницкій, Красницкій, Макуцкій (2), Малецкій, Павловский, Русецкий, Соболевскій*. Таксама да іх далучаюцца і прозвішчы з адпадзеннем канцавога ***й***, што фанетычна набліжае "*рускамоўныя*" надпісы да характэрных для беларускай мовы прозвішчаў на ***-цкі, -скі***: *Бурневски, Жигуновски, Пашкевски, Хамицки* (РПН № 16, 97, 207, 241). Частотнасць ужывання прозвішчаў такога тыпу цалкам карэлюецца з прадуктыўнасцю прозвішчаў на ***-ский / -цкий, -евский / -овский*** для тэрыторыі сучаснай Мінскай вобласці [2, с. 28].

Астатнія агульнаславянскія прозвішчныя тыпы прадстаўлены даволі сціпла і сустракаюцца толькі ў 7 выпадках са 132: *Мартончикъ (2), Мацералникъ, Ройникъ, Дреневъ, Хадзеевъ, Куравкин* (РПН № 162, 170, 213, 62, 240, 143).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Адзінкавым ужываннем характарызуецца ўсходнеславянскі прозвішчны тып на ***-енко***: *Ларченко* (РПН № 146).

Унутрымоўныя прозвішчныя тыпы прадстаўлены онімамі з двума прозвішчаўтваральнымі фармантамі: уласцівым для ўкраінскай мовы ***-ко*** (*Малявко, Ревко, Шацко* (РПН № 160, 215, 246) і ўласцівым для беларускай мовы ***-онок*** (Гезущонокъ (РПН № 42).

Большасць з прааналізаваных жаночых прозвішчаў (96) не мае відавочных спецыяльных гендарных марфалагічных індыкатараў, іх прыналежнасць жанчыне вызначаецца толькі ў кантэксце, у звязцы з імем. Яны прадстаўлены наступнымі прозвішчнымі тыпамі:

першасныя прозвішчы: *Волчекъ, Гурбан, Дрень, Кошуръ, Новикъ, Рагойша, Ревка, Сергѣй, Сергей, Соколъ (2);*

прозвішчныя тыпы суфіксальнага ўтварэння на:

***-іч / -ич*, *-ович / -евич***: *Атрасевичъ (2), Ванковичъ (2), Вашкевичъ, Войничъ, Гринкевич, Гринкевичъ, Dемидович, Драневичъ, Дреневичъ, Казакевичъ, Каспаревич, Каспаревичъ (3), Кастюкевич, Касцюкевичъ, Левановичъ, Масинович, Мідуховичъ, Микулевич, Палюховичъ, Поляковичъ, Панкевичъ, Панкевичъ, Пастуховичъ, Пахневичъ, Турчиновичъ, Юзефовичъ;*

на ***-ик/ -ук***: *Мартончикъ, Мацыральник, Радончик, Романчикъ, Сымукъ, Харужик (2)*.

У якасці “гендарных індыкатараў” можна назваць:

прозвішчны фармант ***-ская, -цкая*** (ад мужчынскага ***-ский / -цкий*** пры змене граматычнай катэгорыі роду). *Буйницкая, Бурневская, Васілевская, Жуковская (4), Загорская (3), Климковская, Крапивницъкая, Красовская, Микулевская, Пол…цкая, Соболевская (2), Славинская* і яго ўсечаны варыянт на ***-ска***, ***-цка***: *Бычковска, Грыбовска, Ивановска, Кашалевска (3), Красницка*;

***-ов, -ав, -ев, ин- + а***: *Волчкава, Гардъева, Довнарова, Дренева, Желткова, Жолткова*, *Куралесава*.

Асобнай увагі сярод жаночых прозвішчаў заслугоўваюць тыя, якія ўтвораны пры дапамозе прозвішчаўтваральнага фарманта ***-іч-*** і дадатковага постфікса ***-ова /-ава***, што не характэрна для сучасных беларускіх жаночых прозвішчаў. Ён з’яўляецца архаічнай вытворнай формай роднага склону ад мужчынскага прозвішча і адыгрывае функцыю падкрэслівання родавай прыналежнасці: *Анисевичова, Ерашевичава, Машукевичова, Палюховичова, Патаповічова* (РПН 1, 109, 171, 187, 204). Таксама варта адзначыць, што такі тып утварэння жаночага прозвішча ад мужчынскага, шляхам дадання дадатковага да прозвішчаўтваральнага фарманта постфікса-індыкатара, характэрны для тэрыторыі Польшчы і Літвы.

На тэрыторыі некропаля таксама знаходзяцца 11 калектыўных пахаванняў, большасць з якіх – сямейныя. Варта адзначыць, што выражэнне катэгорыі ліку з дапамогай канчаткаў адпавядае нормам літаратурнай мовы: *Астаповичи, Гринкевичи, Жуковския, Загорскія, Казакевичи, Макуцкия (2), Пастуховичи, Севастюк, Харужики, УСЫ.*

Такім чынам, абапіраючыся на аналіз прадуктыўнасці прозвішчных тыпаў на Ракаўскім праваслаўным некропалі XIX – пачатку XX ст., можна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

зрабіць выснову, што сярод праваслаўнага насельніцтва мястэчка Ракаў у названы перыяд найбольшае распаўсюджанне мелі другасныя прозвішчы суфіксальнага ўтварэння з прозвішчаўтваральнымі фармантамі на ***-іч / -ич, -овичˇ / -евич***, а ўнутрымоўныя прозвішчныя тыпы, наадварот, з’яўляюцца найменш прадстаўленай групай. Варта адзначыць, што група першасных прозвішчаў таксама з’яўляецца даволі пашыранай і разнастайнай, што з’яўляецца характэрным для паўночнай часткі Мінскай вобласці і цалкам адпавядае геаграфіі славянскіх прозвішчаў у канцы XIX – пачатку XX ст.

1. Невядомы Ракаў: могілкі пад базыльянскім крыжам / уклад. В. Сямашка. – Мінск : Медысонт, 2014. – 200 с.
2. Тыпалогія і геаграфія славянскіх прозвішчаў / АН БССР, Беларус. кам. славістаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – 68 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ